**Віткоўская Т.У., Вішнеўская І.М., Сотнікава М.С.**

# ДЗЯРЖАЎНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ РЭСУРС “БАНК ЗВЕСТАК АБ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ”

*Ключавыя словы:* дзяржаўны інфармацыйны рэсурс «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь», Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, гісторыка-культурная каштоўнасць, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, электронны пашпарт ГКК.

Ідэя стварыць рэсурс, які б збіраў і захоўваў звесткі пра ўсе гісторыка-культурныя каштоўнасці (далей – ГКК) нашай краіны, узнікла разам са стварэннем суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь.

Пачатак гэтаму паклаў артыкул 25 Закона Рэспублікі Беларусь 1992 г. № 1940-XII «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». Тады ўпершыню і было ўведзена панняцце «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» (далей – Банк звестак). Ён ствараўся «для захавання і сістэматызацыі ўліковых дакументаў па каштоўнасцях, звестак аб адметных выніках і сведчаннях гістарычнага развіцця народа Беларусі, страчаных матэрыяльных аб’ектах і нематэрыяльных праяўленнях чалавечай творчасці, якія маглі б атрымаць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей». Згодна з законам карыстацца інфармацыяй, змешчанай у рэсурсе, маглі першапачаткова толькі юрыдычныя і фізічныя асобы, якія прадстаўлялі Банку інфармацыю аб выяўленых імі новых звестках і падрыхтаваных матэрыялах аб гісторыка-культурнай спадчыне [1].

Іншыя нарматыўныя прававыя акты, згодна з якімі вызначаўся парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак дапоўнілі і развілі канцэпцыю:

- 2006 – Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» № 98-З (артыкул 26) [2],
- 2016 – Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры № 413-З [3].

У артыкулах 101 і 102 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры падрабязна пералічаны патрабаванні да рэсурса. Адной з важнейшых мэт, якая ставіцца перад Банкам звестак – гэта «садзейнічанне дзяржаўным органам, іншым юрыдычным асобам, грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, пры вырашэнні пытанняў і арганізацыі работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, выкананні навукова-даследчых, праектных, рамонтна-рэстаўрацыйных работ, іншых мерапрыемстваў на гісторыка-культурных каштоўнасцях і ў зонах іх аховы».

Таксама Кодэкс пашырыў колькасць карыстальнікаў Банка звестак: дзяржаўныя органы, іншыя юрыдычныя асобы, грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі. Было вызначана, што інфармацыя, якая змяшчаецца ў Банку звестак, і якую можна атрымаць праз зварот у Міністэрства культуры, прадастаўляецца на матэрыяльных носьбітах інфармацыі, а таксама праз глабальную сетку Інтэрнэт [3].

Непасрэдная праца над стварэннем рэсурса “Банк звестак” пачалася яшчэ ў 1990-я гг. Так, у 1996 г. Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр распрацаваў канцэпцыю Банка звестак, яго эскізны праект, тэхнічнае заданне, але рэалізаваны яны былі часткова і створаны Банк звестак не адпавядаў усім крытэрыям, якія былі запланаваны.

З 1996 г. па 2022 г. Банк звестак выглядаў як прыкладанне на асобным камп’ютары. Галоўным недахопам Банка звестак з’яўлялася яго абмежаванасць: збор і адміністраванне дадзеных па ГКК ажыццяўляліся толькі адмысловым спецыялістам на выдзеленым працоўным месцы. Гэта прывяло да таго, што шырокае кола спецыялістаў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны не мела доступ да інфармацыі, змешчанай у рэсурсе; дадзеныя ў папяровых пашпартах і тых, якія меліся ў базе, часам не супадалі, альбо папяровы пашпарт мог не мець свайго адпаведніка ў электронным

Банку звестак, што рабіла недакладнай статыстыку ў рэсурсе. Было зразумела, што Банк звестак як інфармацыйны рэсурс, які збірае і захоўвае звесткі пра ўсе ГКК і гісторыю іх выкарыстання, не спраўляецца са сваёй задачай.

Пасля прыняцця ў 2016 г. Кодэкса Рэспублікі Бларусь аб культуры быў зацверджаны парадак фарміравання Банка звестак і парадак азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім. Кодэкс дэтальна абазначыў мэты і парадак фарміравання рэсурса.

Было вызначана, што ў Банку звестак на кожную каштоўнасць запаўняецца ўліковы дакумент у форме электроннага пашпарта, які павінен мець наступныя раздзелы:

- уліковыя дадзеныя і месца знаходжання каштоўнасці, шыфр адпаведна Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей;
- абгрунтаванне надання статусу каштоўнасці з указаннем рашэнняў дзяржаўных органаў, згодна з якімі культурнай каштоўнасці нададзены статус, а таксама страціўшых сілу нарматыўных прававых актаў, паводле якіх нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці раней;
- характарыстыка ўласнікаў (уладальнікаў) і звесткі аб ахоўных абавязацельствах;
- інфармацыя пра адказных за правядзенне работ асоб і звесткі аб наяўнасці навукова-тэхнічнай дакументацыі на рэстаўрацыю і іншыя віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, звесткі аб зонах аховы;
- гісторыя фарміравання і выкарыстання каштоўнасці, кароткае апісанне і гістарычная даведка пра яе;
- характарыстыка сучаснага тэхнічнага стану каштоўнасці;
- звесткі аб элементах каштоўнасці, якія маюць самастойны статус;
- графічныя матэрыялы і фотаздымкі, у тым ліку ў розныя перыяды яе існавання або бытавання;
- архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы [3].

Таксама, згодна з Кодэксам, раздзелы электроннага пашпарта могуць быць дапоўнены іншымі звесткамі, якія змяшчаюць важную для характарыстыкі гісторыка-культурнай каштоўнасці інфармацыю. Так, для апісання аб’ектаў археалогіі ўведзены дадатковыя палі, якія змяшчаюць звесткі пра даследчыкаў ГКК, культурную прыналежнасць аб’екта, таўшчыню культурнага пласта, апісанне і памеры абарончых збудаванняў і інш.

Была прадугледжана магчымасць стварэння сайта Банка звестак для агульнага азнаямлення з пэўнай інфармацыяй пра ГКК Рэспублікі Беларусь.

Згодна з загадам Міністэрства культуры ад 12 студзеня 2021 г. № 1/ОД «О делегировании полномочий» на Нацыянальную бібліятэку Беларусі (далей – НББ) ускладзены паўнамоцтвы па вядзенні і фарміраванні Банка звестак, стварэнні новага праграмнага забеспячэння з мэтай пераносу інфармацыі з састарэлай платформы на новую версію сайта, з магчымасцю адкрытага карыстання некаторай часткай інфармацыі Банка звестак. З 1 сакавіка 2021 г. НББ распачала працу па вядзенні Банка звестак. Быў створаны сектар фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне [4].

За апошнія гады быў зроблены вялікі аб’ём працы па мадэрнізацыі рэсурса: была праведзена праца па вывучэнні напоўненасці перададзенага праектным філіалам ААТ «Белрэстаўрацыя» рэсурса, распрацаваны тэхнічныя патрабаванні на мадэрнізацыю інфармацыйнага рэсурса, вызначаны яго структура, функцыянал і алгарытм напаўнення. Быў прааналізаваны замежны вопыт фарміравання і вядзення падобных рэсурсаў.

У канцэпцыю новага сайта быў пакладзены прынцып збора і адміністравання дадзеных не адной асобай, а шырокім колам спецыялістаў, задзейнічаных у сферы

дзяржаўнай аховы гісторыка-культурнай спадчыны: ад дзяржслужбоўцаў да адказных асоб рай- і гарвыканкамаў (што прадугледжвалася яшчэ ў 1996 г.).

З дапамогай міграцыі дадзеныя са старога Банка былі перанесены на новы сайт. Пасля гэтага супрацоўнікі НББ рэдагавалі электронныя пашпарты, стваралі новыя (бо спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей рэгулярна папаўняецца), праводзілі іншыя работы па гарманізацыі рэсурса з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей. Спецыялістамі сектара фарміравання Банка звестак была распрацавана падрабязная Інструкцыя па працы з інфармацыйным рэсурсам «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» для спецыялістаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, адказных за ахову гісторыка-культурнай спадчыны (далей – Інструкцыя), якая была зацверджана Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у студзені 2022 г. Інструкцыя была накіравана ў тэставыя раёны (Гарадоцкі Віцебскай вобл., Пружанскі Брэсцкай вобл., Мазырскі Гомельскай вобл., Карэліцкі Гродзенскай вобл.) для апрабацыі працы з Банкам звестак.

З лютага 2023 г. па зацверджаным Міністэрствам культуры графіку запаўнення электронных пашпартоў на гісторыка-культурныя каштоўнасці да працы з Банкам звестак далучыліся спецыялісты мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, адказныя за ахову гісторыка-культурнай спадчыны свайго рэгіёну. Была праведзена маштабная работа па напаўненні сайта. Інфармацыя, якую дадавалі мясцовыя спецыялісты праходзіла мадэрацыю супрацоўнікаў сектара фарміравання Банка звестак НББ і пасля захоўвалася на сайце. Работа па напаўненню Банка звестак ажыццяўляецца безперапынна, так як з'яўляюцца новыя аб'екты, якім надаецца статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, з'яўляецца дадатковая інфармацыя на каштоўнасці, што ўжо існуюць у Банку звестак.

На сённяшні дзень Банк звестак уяўляе сабой інтэрнэт-сайт, які складаецца з дзвюх кропак уваходу: публічнай і адміністратарскай часткі. Да публічнай часткі маюць доступ усе карыстальнікі інтэрнэту. Яны бачаць наступныя раздзелы: спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей з шырокім пошукавым фільтрам, інтэрактыўную мапу размяшчэння каштоўнасцей па тэрыторыі Беларусі, навіны па тэме, раздзел «Цікавае» (актыўны, калі ўтрымлівае інфармацыю). Такім чынам, мадэрнізаваны Банк звестак прадугледжвае папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

У адміністратарскую частку маюць доступ адміністратары сайта (непасрэдна супрацоўнікі сектара фарміравання Банка звестак НББ), прадстаўнікі Міністэрства культуры, рэгіянальныя спецыялісты, адказныя за ахову спадчыны ў раёнах рэспублікі. Усе яны маюць розныя ролі і адпаведна розны доступ да інфармацыі. Больш за ўсіх паўнамоцтвы маюць адміністратары – супрацоўнікі сектара фарміравання Банка звестак НББ. Яны могуць ствараць новы аб'ект, выдаляць яго, запаўняць усе палі электроннага пашпарта, даваць доступ іншым карыстальнікам, пісаць навіны на сайт, змяняць галоўную інфармацыю на сайце, глядзець статыстыку наведвання сайта, статыстыку запаўнення, пісаць паведамленні карыстальнікам і г.д. Адміністратары сайта рэгіструюць мясцовых спецыялістаў з роляй «адказны супрацоўнік». Ён уносіць змены ў электронныя пашпарты, дадае інфармацыю і новыя дакументы. Уведзеныя мясцовымі спецыялістамі дадзеныя трапляюць у раздзел «Мадэрацыя» на праверку адміністратарам. Адміністратары, ў сваю чаргу, правяраюць карэктнасць уведзеных дадзеных, каментуюць, дасылаюць падказкі, узгадняюць або адхіляюць пашпарт, рэгулююць увесь працэс напаўнення рэсурса.

Сайт Банк звестак мае «Архіў». У ім змяшчаюцца ГКК, якія згубілі свой статус па розных прычынах. Захаванне гэтых звестак дапаможа адсачыць прычыны знікнення помнікаў і прадухіліць іх знікненне ў далейшым.

У сакавіку 2023 года праектны філіял ААТ «Белрэстаўрацыя» перадаў у Банк звестак навукова-праектную дакументацыю на гісторыка-культурныя каштоўнасці ў электронным

выглядзе за перыяд 2014 г. – сакавік 2023 г. Пачынаючы з гэтага перыяду ўся навукова-праектная дакументацыя на гісторыка-культурныя каштоўнасці паступае на захоўванне ў Банк звестак і будзе даступна для выкарыстання па запыце спецыялістаў.

У адпаведнасці з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 09 чэрвеня 2025 г. № 99 «О Банке сведений об историко-культурном наследии Республики Беларусь» з 1 студзеня 2026 г. НББ будзе ўпаўнаважана прадастаўляць доступ да карыстання рэсурсамі Банка звестак дзяржаўным органам, іншым юрыдычным асобам, грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам. Запыт карыстальнікаў аб доступе да карыстання рэсурсамі Банка звестак можа быць накіраваны непасрэдна ў Міністэрства культуры ці праз запаўненне электроннай формы на сайце Банка звестак у сетцы Інтэрнэт (heritage.gov.by), прывязанай да электроннага паштовага адрасу Міністэрства культуры. Па кожным запыце, што паступіў у Міністэрстве культуры прымаецца рашэнне аб прадастаўленні ці адмове ў прадастаўленні доступу да карыстання рэсурсамі Банка звестак, аб аб’ёме і паўнаце прадастаўляемай інфармацыі. Дадзеная інфармацыя пісьмова даводзіцца да НББ. НББ прадастаўляе доступ да карыстання рэсурсамі Банка звестак на падставе прынятага Міністэрствам культуры рашэння. НББ інфармуе карыстальнікаў аб адмове ў прадастаўленні доступа да карыстання рэсурсамі Банка звестак, ці прадастаўленне доступа да карыстання рэсурсамі Банка звестак у аб’ёме меншым, чым быў запыт [5].

Банк звестак прайшоў працяглую гісторыю ад зараджэння праекта да рэалізацыі. Гэта карысны і жыццяздольны рэсурс, які неабходна рэалізаваць да канца, каб ён стаў той платформай, на якую абапіраліся б навукоўцы і дзяржаўныя органы, грамадзяне і індывідуальныя прадпрымальнікі, аб’яднаныя адной мэтай – захаванне гісторыка-культурнай спадчыны нашай краіны. З дапамогай Банка звестак гэта старонка жыцця Беларусі стане для ўсяго насельніцтва больш даступнай, зразумелай і цікавай.

1. Об охране историко-культурного наследия : Закон Респ. Беларусь от 13 нояб. 1992 г. № 1940-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. – 1992. – № 30. – Арт. 504 // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 16.10.2025).

2. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь ад 9 студз. 2006 г. № 98-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2006. – № 9. – 2/1195 // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 16.10.2025).

3. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 21 ліп. 2022 г. № 201-З // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 16.10.2025).

4. О делегировании полномочий : приказ М-ва культуры Респ. Беларусь от 12 янв. 2021 г. № 1 // Архив Министерства культуры Республики Беларусь.

5. О Банке сведений об историко-культурном наследии Респ. Беларусь : приказ М-ва культуры Респ. Беларусь от 9 июня 2025 г. № 99 // Архив Министерства культуры Республики Беларусь.

**Гавриленков А.Ф.**

## ИСТОРИЧЕСКАЯ ПАМЯТЬ О ПОБЕДЕ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941–1945 ГГ. КАК ИНСТРУМЕНТ БОРЬБЫ С ФАЛЬСИФИКАЦИЕЙ ИСТОРИИ

*Ключевые слова*: культура, историческая память, Великая Отечественная война, фальсификация истории, искажение истории.

Культура представляет собой результат деятельности человека в материальной и духовной сфере. Для человека на всех этапах его развития важным было сохранить созданное, суметь передать его будущим поколениям. Таким образом культура «воссоздается» каждым новым поколением людей [1, с. 156]. Для человека важным является сохранение прошлого, воплощенного не только в материальных объектах, но и в духовных объектах. В действительности два эти аспекта культуры невозможно разделять. Один до-